# З КРЫВІ І ПЛОЦІ

**Віктар СУПРУНЧУК**

**Наш зямляк пісьменнік Віктар Супрунчук (нарадзіўся ў 1949 годзе у в. Сялец) прапануе ўвазе чытачоў газеты «Маяк камунізма» ўрывак са свайго новага рамана «З крыві і плоці», які плануецца выдаць у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 1991 годзе. Напамінаем, што В. Супрунчук — аўтар зборнікаў прозы «Страсці», «Недзе баліць ля сэрца» і рамана «Жывем толькі раз». У новым творы пісьменніка адлюстраваны падзеі часоў паўстання Кастуся Каліноўскага і нашай сучаснасці. У ім дзейнічаюць рабочыя і сяляне, інтэлігенцыя, прадстаўнікі кіруючых органаў.**

Сваю старую дачу Зушчыц перапісаў на сястру, якую забраў з вёскі. Гэта было зрабіць нялёгка, але дапамаглі сябры. Ён бы ніколі ў жыцці не займаўся б такой, не зусім юрыдычна чыстай справай, калі б не ведаў, што ў Зялёным бары, дзе таксама былі ўніверсітэцкія дачы, удава прафесара Кержуха прадае сваю дачу. Неблагі, двухпавярховы будынак, хоць і не дагледжаны, але калі трошкі папрацаваць над ім, дык атрымаецца проста лялька. І Вацлаў Казіміравіч купіў ва ўдавы гэту дачу. Ён адзін раз толькі сустрэўся з жанчынай, пажылой, з дрыжачай галавой кабетай, якой, мусіць, вельмі не хацелася прадаваць дачу, але настойвалі дзеці. Яны жылі ў Маскве, яны адарваліся ад Беларусі і ў іх не было жадання сюды ездзіць, тым больш, што мелі свае дачы, як зразумеў Вацлаў Казіміравіч, пад Кубінкай. Па яго просьбе ўсімі фармальнасцямі, звязанымі з афармленнем дакументаў, займаўся Ярыга. Недзе за месяц ён усё аформіў і перадаў ключы ад дачы Вацлаву Казіміравічу, якому не спатрэбілася псаваць нервы і здароўе, ходзячы па чыноўніцкіх кабінетах. Ярыга надзіва аказаўся кемлівым і здольным арганізатарам, урэшце недарма ён прэтэндаваў на званне дацэнта.

Ключы ад дачы былі ў кішэні, і Вацлаў Казіміравіч вырашыў з'ездзіць у Зялёны бор. Гэтая думка яму прыйшла пасля абеду, калі ён, вярнуўшыся на кафедру, убачыў Галіну, якая апошнім часам рэдка прыходзіла ва ўніверсітэт, таму што працавала над дысертацыяй, да абароны ўжо было і не так далёка. Яму раптам захацелася запрасіць з сабой паехаць Галіну. Ягоная «Волга» стаяла ля галоўнага корпуса з поўным бакам бензіну.

Ім пакуль ніхто не мог перашкодзіць: жонка была ў Чэхаславакіі яшчэ, ніякіх нарад на тыдні не планавалася.

На выездзе з горада Зушчыц спыніўся каля ўнівермага і купіў кілбасы, хлеба, мінеральнай вады і бутэльку шампанскага. Пакупкі нёс да машыны ў торбачцы, навошта людзям мазоліць вочы, а раптам некага са знаёмых спаткаеш. У гэтым раёне і сапраўды быў універсітэцкі дом, летась яго здалі, і побач з ім будавалі яшчэ адзін. Зрэдзь пры выпадку заязджаў сюды рэктар на будоўлю. Рэктар быў малады і, пэўна, хацеў адзначыць пачатак свайго кіраўніцтва новым домам для супрацоўнікаў універсітэта. Такія-сякія планы наконт гэтага дома былі і ў Вацлава Казіміравіча, але ён нікому пра іх ніводнага слова не выказваў. Яшчэ было рана з імі знаёміць рэктара, дый невядома яшчэ, як успрыме ён іх.

Зушчыц толькі паспеў расказаць Галіне адзін анекдот, як амерыканскі прэзідэнт і наш дзяржаўны дзеяч ляцелі ў самалёце, і яны пад'ехалі ўжо да Зялёнага бору. Мо якая хвіліна па завулачках пасёлка і — спыніліся ля дачы. Зушчыц зноў, у які ўжо раз падумаў, што не прагадаў, набыўшы яе.

Была дача недалёка ад электрычкі і ад аўтобуснага прыпынку. Дом складзены з тоўстых яловых смалякоў, цяпер такі зруб цяжка зрабіць: і дарага, і лесу не проста знайсці. Трэба мець знаёмствы ў лясніцтве. А проста так не возьмеш: нечым плаці. Улічваючы, што прафесар, дык дапамагай нейчаму сыну ці пляменніку паступіць вучыцца. Гэта ж не пяцідзесятыя і нават не шасцідзесятыя гады, калі можна было вельмі проста дамовіцца з калегамі і ўладкаваць ва ўніверсітэт каго патрэбна. Дык ён і ўладкаваў не аднаго: пяць пляменнікаў і пляменніц. А колькі розныя знаёмыя прасілі. Канечне, прасіў яго не абы-хто, а людзі з персанальнымі машынамі.

**(Працяг у наступным нумары).**